УДК 94 (476)

# СІМВОЛІКА БЕЛАРУСКІХ ВЯСЕЛЬНЫХ АТРЫБУТАЎ І ІХ САКРАЛЬНАЕ ЗНАЧЭННЕ

Кроцікава Марыя Валер'еўна
магістрант установы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"
(г. Віцебск, Беларусь)

*У напрамку неабходным беларускаму грамадству для культурнага адраджэння, вялікая роля надаецца народным абрадам і звычаям, якія ахопліваюць усе галоўныя этапы жыцця чалавека. Адным з асноўных з'яўляецца вясельны абрад, які сёння вельмі важны да панавання ў грамадстве культу сям'і. Этапы вясельнага абраду характарызуюцца асаблівымі дзеяннямі, што павялічвае цікавасць моладзі да заключэння афіцыйнага шлюбу.*

Наша краіна Беларусь вызначаецца шматбаковай духоўнай культурай, значнае месца ў якой займаюць народныя звычаі і абрады, неабходныя для абгрунтавання самастойнаці этнаса. У сувязі з гэтым трэба адзначыць, што спрадвеку чалавек суправаджаў своеасаблівай цырымоніяй і сімволікай усе значныя моманты свайго жыцця. Але шмалікія старадаўнія сімвалічныя звычаі сёння,на жаль, у большасці забыты і аб іх існаванні можна даведацца толькі са звестак летапісаў, фальклорных матэрыялаў і этнаграфічных апісанняў. Даўжэй за ўсё захоўвалася сімволіка, звязаная з вяселлем. Яна сёння патрэбна нашаму грамадству дзеля распаўсюджвання і захавання сямейных каштоўнасцей.

Пра разнастайную вясельную сімволіку на беларускіх землях, аб адраджэнні якой сення клапоцiцца наша грамадства, узгадваюць вядомыя этнографы XIX – пачатку XX ст.: П. Шэйн, Е. Раманаў, А. Дамбавецкі, М. Федароўскі, М. Нікіфароўскі і іншыя [1, с. 64]. Паводле іх паведамленняў, члены вясельнай дружыны вылучаліся пэўнымі прыкметамі: часцей за ўсё гэта былі кветкі, якія прышпільваліся ў залежнасці ад сямейнага становішча злева або справа да галаўнога ўбору і вопраткі.

Цікавымі для сённяшняга часу будуць абставіны, калі працягам перадвясельнай падрыхтоўкі быў комплекс абрадавых дзеянняў, сімвалізуючых падрыхтоўку да прыняцця маладымі новага сацыяльнага статусу.У тым ліку, напярэдадні вяселля ў хаце нявесты спраўлялі "Дзявочнік" – застолле-падзяку для сяброўак, а ў хаце жаніха ладзілі "Хлапечнік". Даследчык М. М. Нікольскі ў "Паходжанні і гісторыі беларускай вясельнай абраднасці" сцвярджае, што ўжо ў XIi–XIV стст. дзявочы вечар меў месца ў паўночных беларускіх рэгіёнах. Першая пісьмовая фіксацыя "Дзявочага вечара" датавана XVIII ст. Таксама і ў XIX–XX стст. "Дзявочнік" быў адным з галоўных частак вясельнага абраду [2, с. 54]. І сення, часам, гэты звычай мае ўжытак сярод нашай моладзі, часцей за ўсе ў сельскай мясцовасці.

Вясельны абрад суправаджаўся шматлікімі дзеяннямі. Так, падчас "Дзявочніка" і "Хлапечніка" выраблялі вясельныя ўпрыгожванні – "кветачкі", "бутаньеркі" для дружкоў і сяброўак. У некаторых рэгіёнах Беларусі абрады, што выконваюцца напярэдадні вяселля, лічылі пачаткам уласна вяселля [3, с. 315]. І рыхтаваліся да гэтага загадзя.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Пры разглядзе заяўленых пытанняў трэба зыходзіць з таго, што традыцыйнае беларускае вяселле – гэта таямнічы, але разам з тым адкрыты да ўсеагульнага агляду свет разнастайных знакаў. Да іх адносіліся абрадавыя дзеянні, прадметы, якія мелі статус рытуальнага атрыбута: адзенне, спецыфічныя стравы, спецыфічныя дыялогі і іншае [4, с. 208]. Абрадавым атрыбутам надавалася асаблівая ўвага, бо кожны з іх быў звязаны з глыбокім магічным зместам. Вядома, разам з вонкавымі, даступнымі атрыбутамі, што бачылі прысутныя, былі і атрыбуты, схаваныя ад людскіх вачэй, і менавіта яны мелі таямнічы змест [5, с. 100]. Пасля выкanання практычна ўсіх каляндарных абрадаў і абрадаў сямейна-родавай накіраванасці галоўны атрыбут атрымліваў статус надзейнага абярэга [4, с. 208]. Сярод гэтых атрыбутаў перш за ўсе трэба вызначыць вясельнае адзенне маладых, вянок і вэлюм нявесты, заручальныя пярсцёнкі, ручнікі і каравай.

Значная частка вясельнага абраду мела тэрытарыяльныя асаблівасці. Меў вялікую колькасць варыятыўных назваў, напрыклад, дзявочы вечар на Шклоўшчыне. Некаторыя з якіх прыгадала мясцовая жыхарка гэтага рэгіену Шалаева Марыя. Гэта “Дзявочнік”, дзявочы вечар, “вечарынка”, “вечарына”, “вечаруха”.Неабходна адзначыць, што дзявочнік напярэдадні вяселля адбываўся не на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Зыходзячы з надрукаваных даследаванняў, “Адсутнічае “Дзявочнік” участцы Магілёўшчыны і на Палессі.Там сустракаюцца толькі фрагменты гэтага рытуалу”, – канстатуе вядомы даследчык беларускай вясельнай паэзіі і абраднасці Л. А. Малаш [6, с. 12]. З іншага боку, у в. Гарадзец Шклоўскага раёна выраб вясельных атрыбутаў адбываўся падчас дзявочага вечару, што пацверджана словамі Букетавай Ганны: “Мама расказвала пра вечары, калі ў доме маладой збіралася радня нявесты. Яны вечарам гатовілі вяночак для маладой, дзелалі “кветачкі””.

Падчас вывучэння вясельнай абраднасці варта вызначыць ролю і значэнне такога галаўнога ўбору, як вянок. Гэта абавязковы абрадавы атрыбут, элемент традыцыйнага славянскага адзення як мужчыны, так і жанчыны. З цягам часу вянок стаў сімвалічным галаўным уборам незамужніх дзяўчат [3, с. 314]. Вянок – гэта вызначальны сімвал дзявоцтва, і таму па старадаўніх звычаях жанчына не мела права надзяваць вянок [7, с. 386]. Вянок плялі напярэдадні вяселля сяброўкі нявесты ці “маладухі”. Жыхарка в. Гарадзец Быкава Зінаіда ўспамінае: “Перад вяселлем дзяўчаты збіраліся ў доме маладой, каб пагаварыць. Песні спявалі і абязацельна ў гэты вечар вянок плялі. Дзелалі яго з гафрыраванай паперы, або з тканіны. Бывала загадзя кусок ткані накрахмаліш, і каб розныя колеры тканіны былі, каб вянок удаўся. Бывала, толькі з белых тканін рабілі, пад колер адзежы, а маглі, напрыклад, двухколерны зрабіць, як каму падабалася. Але звычайна белыя кветкі рабілі”.

Каштоўным адрозненнем беларускай вясельнай абраднасці з'уляецца яе разнастайнасць. У даследаванні Я. Крука “Белорусская свадьба” ўзгадваецца пра важны атрыбут-маркер абраду – вясельнае дрэўца. Прысутнасць гэтага сімвалічнага прадмета часцей за ўсё фіксуецца на Палессі і Гродзеншчыне. З прыходам хрысціянства вясельнае дрэўца (елка, ельца) апынулася на вясельным стале перад маладымі як увасабленне міру і дабра [4, с. 293]. У даследуемай мясцовасці Шклоўшчыны ніхто з апытуемых пра дрэўца не ўзгадваў. З гэтае нагоды можна меркаваць, што прысутнасць дадзенага атрыбута падчас вяселля ўвогуле была з'явай выключнай, або ў перыяд канца XIX – першай паловы XX ст., калі былі надрукаваны даследаванні па беларускай вясельнай абраднасці,гэты прадмет па невядомых прычынах не адзначалі.

У сукупнасці абрадавых прадметаў адно з галоўных, а, мабыць, і галоўнае месца, займае пярсценак – як неад'емная частка шлюбнай сувязі паміж мужам і жонкай. Маючы круглую форму, пярсцёнак выступаў пасярэднікам або сувязным звяном паміж светам жывых і светам продкаў, як адзін з прадказальнікаў лёсу чалавека. З пярсценкам звязаны цэлы шэраг асаблівых звычаяў, у тым ліку яшчэ да вяселля. Так, аб мяцовых варожбахраспавяла таксама жыхарка в. Гарадзец Шалашэнь Ганна: “Калі падвесіць кальцо на нітку і вадзіць ім па літарах алфавіту, можна даведацца імя каханага. А можна набраць стакан вады, на нітцы падвесіць кальцо. Колькі разоў ударыцца аб сценкі, праз столькі гадоў і пойдзеш замуж. Гэтак жа заўсёды на Каляды і на Хрышчэнне варажылі”.

Некаторыя жанчыны в. Гарадзец распавялі, што пярсцёнак надзявалі на безназоўны палец і тлумачылі гэта тым, што сярод людзей жыве павер'е, быццам гэты палец вянозна злучаны з сэрцам. Але існуюць і іншыя тлумачэнні. Яшчэ ў Старажытным Егіпце чацвёрты (безназоўны) палец лічыўся пальцам Сонца, а таму здольны кіраваць плённым і жыццёвым поспехам чалавека. Для нашэння заручальнага пярсцёнка народная мудрасць прадказвала выбар безназоўнага пальца, таму што менавіта ён лічыўся самым надзейным і абароненым з усіх пяці, бо яго дастаткова складана выпрастаць без ўдзелу іншых пальцаў рукі [4, с. 264]. Значыць і пярсцёнак будзе дастаткова цяжка зняць, змяніць такім непрадказальным чынам свой лес.

Такім чынам, перадвясельны этап складае важную частку самога сакральнага дзеяння, выклікае цікавасць грамадства да стварэння сям'і, абуджае моладзь прытрымлівацца ўсяго разнастайнага комплексу абрадаў і звычаяў. У тым ліку “Дзявочнік” і “Хлапечнік” на прыкладзе Шклоўшчыныпаказвае, што мерапрыемствы гэтых этапаў вяселля ўключалі ў сябе непасрэдную падрыхтоўку да святочнага дня. Сярод яе трэба вызначыць выраб вясельных атрыбутаў. Кожны з іх меў сваю сімволіку і накіраванасць, а таксама выконваў строга вызначаную ролю ў дзень урачыстасці. Можна сцвярджаць, што традыцыйнае беларускае вяселле (на прыкладзе паўночнай Магілёўшчыны) мае дастаткова вызначаную сімволіку, якая складалася на працягу некалькіх стагоддзяў, прыцярпела паўныя змены, але ў той або іншай ступені захоўвуецца і сёння, што дазваляе выкарыстоўваць яе дзеля агульнага адраджэння беларускай духоўна-матэрыяльнай культуры.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Федароўскі, М. Люд беларускі. Вяселле / М. Федароўскі. – Мінск : Полымя, 1991. – 142 с.
2. Никольский, Н. М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н. М. Никольский. – Минск : Академия Наук БССР, 1956. – 270 с.
3. Виноградова, Л. Н. Венок / Л. Н. Виноградова, С. М. Толстая // Славянские древности / под ред. Н. И.Толстого. – Москва : Международные отношения,1995. – 584 с.
4. Котович, О. В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / Оксана Котович, Янка Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.
5. Каспяровіч, В. Сімвалы беларускага вяселля // Роднае слова. - 2005. – № 4. – С. 98–102.
6. Вяселле: абрад. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 683 с.
7. Белорусы. – Мінск: Наука, 1998. – 503 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова